# ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАВЕДНІК
# па **экзамене васьмікласніка**
## з 2018/2019 навучальнага года

## Прынцыпы правядзення
## і допуску да экзамену

Цэнтральная экзаменацыйная
камісія
Варшава 2017

Інфармацыйны даведнік падрыхтаваны Цэнтральнай экзаменацыйнай камісіяй на падставе заканадаўчых актаў, пададзеных у секцыі А.

Цэнтральная экзаменацыйная камісія
ul. Józefa Lewartowskiego 6, 00-190 Warszawa
tel. 22 536 65 00
sekretariat@cke.edu.pl

**Рэдактарскі калектыў:**

dr Marcin Smolik (CKE)
Edyta Warzecha (CKE)
Ludmiła Stopińska (CKE)
dr Wioletta Kozak (CKE)

## A. Юрыдычныя падставы экзамену васьмікласніка

Экзаменаванне васьмікласнікаў адбываецца на падставе арт. 44zs Закону аб сістэме асветы ад 7 верасня 1991 г.[1]. Упершыню экзамен адбудзецца ў 2018/2019 навучальным годзе.

Пытанні, звязаныя з экзаменам васьмікласніка, падрабязна разглядаюцца ў наступных заканадаўчых актах:

| ЮРЫДЫЧНЫ НАРМАТЫЎ | РЭГУЛЯВАНЫЯ ПЫТАННІ |
|---|---|
| Закон аб сістэме асветы ад 7 верасня 1991 г.<br>(tekst jedn. Dz.U. z 2016 r. poz. 1943, ze zm.) | Галоўныя прынцыпы правядзення экзамену васьмікласніка, у тым ліку вызначэнне экзаменацыйных прадметаў, пытанне дастасавання формаў і ўмоў правядзення экзамену васьмікласніка, ануляванне, азнаямленне з працамі. |
| Распараджэнне міністра нацыянальнай адукацыі ад 1 верасня 2017 г. наконт асаблівых умоў і спосабу правядзення экзамену васьмікласніка<br>(Dz.U. z 2017 r. poz. 1512) | Падрабязныя арганізацыйныя і адміністратыўныя нарматывы правядзення экзамену васьмікласніка. |
| Распараджэнне міністра нацыянальнай адукацыі ад 14 лютага 2017 г. наконт базісных праграм дашкольнага выхавання і праграмнага мінімуму агульнага навучання для базавай школы, у тым ліку для вучняў з умеранымі і сур'ёзнымі абмежаваннямі інтэлектуальных магчымасцяў; агульнага навучання для профільнай школы I ступені; агульнага навучання для спецыяльнай адаптацыйнай школы; агульнага навучання для пасляліцэйскай школы.<br>(Dz.U. z 2017 r. poz. 356) | Агульныя і адмысловыя патрабаванні да аб'ёму ведаў і ўменняў, прысваенне якіх правяраецца падчас экзамену васьмікласніка па польскай мове, матэматыцы і сучаснай замежнай мове[2]. |

Інфармацыйныя даведнікі па экзамене васьмікласніка пачынаючы з 2018/2019 навучальнага года падрыхтаваныя на падставе паўнамоцтва з арт. 9а пар. 2 п. 3 Закона аб сістэме асветы, а таксама з арт. 267 закона ад 14 снежня 2016 г. *Нормы ўвядзення заканадаўчага акта – Адукацыйнае права*[3].

---

[1] Адн. тэкст. Зб. з.а. 2016 г. паз. 1943, са зм.
[2] Пачынаючы з 2022 г. таксама на экзамене васьмікласніка па біялогіі, хіміі, фізіцы, геаграфіі і гісторыі (гл.: Секцыя D *Інфармацыйнага даведніка*).
[3] Dz.U. z 2017 r. poz. 60, ze zm.

## B. Мэты правядзення экзамену васьмікласніка

Удзел у экзамене васьмікласніка бяруць:

- вучні VIII класа базавай школы;
- вучні мастацкіх школ, у якіх рэалізуецца агульнае навучанне ў аб’ёме базавай школы – у класе, навучальная праграма якога адпавядае VIII класу базавай школы;
- слухачы базавых школ для дарослых[4].

Экзамен васьмікласніка з’яўляецца абавязковым: каб скончыць школу, кожны вучань павінен здаць гэты іспыт[5]. У выпадку экзамену васьмікласніка няма акрэсленага мінімальнага выніку, які павінен быць здабыты, таму гэтага іспыту нельга не здаць[6].

Экзамен васьмікласніка выконвае дзве асноўныя функцыі:

1. вызначэнне ўзроўню агульнай адукацыі вучняў у аб’ёме абавязковых экзаменацыйных прадметаў і паданне інфармацыі вучню, яго бацькам, настаўнікам і органам асветы наконт згаданага ўзроўню адукацыі;
2. замяшчэнне ўступнага экзамену ва ўстановы сярэдняй адукацыі, якія выкарыстоўваць вынікі экзамену васьмікласніка па паасобных прадметах у якасці крытэрыяў у працэсе набору – у выпадку, калі колькасць кандыдатаў перавышае колькасць вольных месцаў у дадзенай установе адукацыі[7].

## C. Экзаменацыйны каляндар

1. Экзамен васьмікласніка праводзіцца ў двух тэрмінах – асноўным і дадатковым. У наступнай табліцы пададзеныя месяцы, калі ў розных тыпах школ праводзіцца экзамен васьмікласніка:

| | школы для дзяцей і моладзі; школы для дарослых, навучанне ў якіх заканчваецца ў вясеннім семестры | школы для дарослых, у якіх навучанне заканчваецца ў асеннім семестры |
|---|---|---|
| асноўны тэрмін | красавік | студзень |
| дадатковы тэрмін | чэрвень | красавік |

[4] У *Інфармацыйным даведніку* слова „вучань” акрэслівае і вучняў, і слухачоў.

[5] Экзамену васьмікласніка не здае вучань, які мае афіцыйную даведку наконт патрэбы ў спецыяльным навучанні, выдадзеную ў сувязі з умеранай ці значнай абмежаванасцю інтэлектуальных здольнасцяў альбо ў сувязі са спалучанай інваліднасцю, адна з прычын якой вынікае з умеранай ці значнай абмежаванасці інтэлектуальных здольнасцяў.

Ад экзамену васьмікласніка можа быць вызвалены вучань, які мае афіцыйную даведку наконт патрэбы ў адмысловым навучанні, выдадзеную ў сувязі са спалучанай інваліднасцю, што не звязаная з умеранай ці значнай абмежаванасцю інтэлектуальных здольнасцяў. Заяву пра вызваленне ад экзамену на імя дырэктара акруговай экзаменацыйнай камісіі падаюць бацькі вучня. Згоду на заяве павінен зазначыць дырэктар школы.

Ад экзамену васьмікласніка можа быць вызвалены вучань, які не мог здаваць іспыту як у галоўным, так і ў дадатковым тэрміне з прычыны няшчаснага выпадку альбо цяжкага стану здароўя.

[6] Вынікі экзамену васьмікласніка не маюць уплыву на пераход у наступны клас ў мастацкіх школах, у якіх рэалізуецца агульнае навучанне ў аб’ёме базавай школы – у выпадку, калі клас, навучальная праграма якога адпавядае VIII класу базавай школы, не з’яўляецца апошнім у навучальным цыкле.

[7] Пытанні пераліку на балы працэнтных вынікаў, якія вучань атрымаў на экзамене васьмікласніка, падчас набору ва ўстанову сярэдняй адукацыі рэгулююцца Распараджэннем міністра нацыянальнай асветы ад 16 сакавіка 2017 г. наконт правядзення рэкрутацыйнага працэсу, а таксама дадатковага набору ў дзяржаўныя дашкольныя, адукацыйныя ўстановы і школы (Dz.U. z 2017 r. poz. 610).

2. Экзамен у дадатковым тэрміне здае вучань, які не ўзяў удзелу ў іспыце ў асноўным тэрміне з-за праблем са здароўем альбо праблем іншага характару.
3. У кожным навучальным годзе экзамен васьмікласніка адбываецца паводле сталага календара, які зафіксаваны ў нарматыўных актах, пералічаных у Секцыі A *Інфармацыйнага даведніка*. Асноўныя падзеі экзаменацыйнага календара знаходзяцца ў наступнай табліцы.

| ТЭРМІН | ПАДЗЕЯ |
|---|---|
| Не пазней, чым за 2 гады перад тэрмінам экзамену | Міністр нацыянальнай адукацыі размяшчае ў Бюлетэні грамадскай інфармацыі на сайце МНА абвестку з пералікам прадметных алімпіяд, па выніках якіх лаўрэаты і фіналісты маюць права быць вызваленымі ад экзамену васьмікласніка з дадзенага прадмету[8]. |
| да 20-га жніўня навучальнага года, які папярэднічае году, калі адбудзецца іспыт | Дырэктар Цэнтральнай экзаменацыйнай камісіі (ЦЭК) размяшчае ў Бюлетэні грамадскай інфармацыі на сайце ЦЭК абвестку адносна графіку правядзення экзамену васьмікласніка ў найбліжэйшым навучальным годзе. |
| да 10-га верасня | Дырэктар Цэнтральнай экзаменацыйнай камісіі (ЦЭК) размяшчае ў Бюлетэні грамадскай інфармацыі на сайце ЦЭК:<br>a. абвестку адносна матэрыялаў і дапаможных прыстасаванняў, якімі будзе дазволена карыстацца падчас экзамену васьмікласніка;<br>b. абвестку адносна падрабязных спосабаў дастасавання ўмоў і формаў правядзення экзамену васьмікласніка;<br>c. інфармацыю наконт спосабу арганізацыі і правядзення экзамену васьмікласніка ў бягучым навучальным годзе, у тым ліку ўзоры дакументаў, неабходных для правядзення іспыту. |
| да 30-га верасня | Бацькамі вучня альбо слухачом падаецца на імя дырэктара пісьмовая дэкларацыя, у якой:<br>a. пазначана сучасная замежная мова, па якой вучань альбо слухач будзе здаваць экзамен;<br>b. (пачынаючы з 2022 г.) пазначаны прадмет па выбары, па якім вучань альбо слухач будзе здаваць экзамен;<br>c. зазначаны намер здаваць экзамен па матэматыцы (а пачынаючы з 2022 г. таксама па прадмеце па выбары) на мове пэўнай нацыянальнай меншасці, этнічнай меншасці альбо на рэгіянальнай мове (глядзі: Секцыя G *Інфармацыйнага даведніка*). |
| прыблізна да 15 га студзеня (за 3 месяцы да экзамену)[9] | Бацькам вучня альбо слухачу дазваляецца пісьмова паінфармаваць дырэктара школы пра змены ў дэкларацыі, складзенай да 30-га верасня. |
| прыблізна да 30 га сакавіка (не пазней, чым за 2 тыдні перад экзаменам)[9] | Лаўрэаты і фіналісты прадметных алімпіяд, а таксама лаўрэаты прадметных конкурсаў узроўню ваяводства альбо вышэй могуць (праз дырэктара школы) перадаць у акруговую экзаменацыйную камісію (АЭК) інфармацыю пра змену ў дэкларацыі, складзенай да 30-га верасня (гл.: Секцыя H *Інфармацыйнага даведніка*). |

[8] Абвестка адносна алімпіяд, якія вызваляюць ад экзамену васьмікласніка па абраным прадмеце, у 2019 годзе будзе зроблена да 1-га верасня 2017 г. (арт. 300 закона ад 14 снежня 2016 г. *Нормы ўвядзення заканадаўчага акта – Адукацыйнае права*).

[9] Дакладны тэрмін залежыць ад тэрміну правядзення экзамену ў канкрэтным навучальным годзе і падаецца ў раздзеле *Інфармацыя па арганізацыі і правядзенні экзамену васьмікласніка*, публікаваным у дадзеным навучальным годзе ў Бюлетэні грамадскай інфармацыі на інтэрнэт-старонцы ЦЭК.

| | |
|---|---|
| другая палова красавіка | Асноўны тэрмін экзамену васьмікласніка. |
| першая палова чэрвеня | Дадатковы тэрмін экзамену васьмікласніка. |
| Дзень заканчэння навучальнага года | Дырэктар школы перадае вучням разам з пасведчаннем аб заканчэнні школы даведку з падрабязнымі вынікамі экзамену васьмікласніка. |

## D. Прадметы на экзамене васьмікласніка

1. Экзамен васьмікласніка праводзіцца ў пісьмовай форме.

2. У 2019–2021 гадах васьмікласнік здае экзамен па трох абавязковых прадметах:
   a. польскай мове;
   b. матэматыцы;
   c. сучаснай замежнай мове.

3. Пачынаючы з 2022 года васьмікласнік здае экзамены па чатырох абавязковых прадметах:
   a. польскай мове;
   b. матэматыцы;
   c. сучаснай замежнай мове;
   d. адным прадмеце па выбары: біялогіі, хіміі, геаграфіі альбо гісторыі.

4. Васьмікласнік здае экзамен па адной з сучасных замежных моў: англійскай, французскай, іспанскай, нямецкай, рускай, украінскай альбо італьянскай. Вучань можа выбраць толькі тую мову, якую ён вывучаў у школе ў рамках абавязковых адукацыйных заняткаў.

5. Экзамен васьмікласніка па сучаснай замежнай мове праводзіцца на падставе патрабаванняў, акрэсленых у праграмным мінімуме агульнага навучання па сучаснай замежнай мове ў версіі II.1.

## E. Ход экзамену васьмікласніка

1. Экзамен васьмікласніка праводзіцца паслядоўна на працягу трох дзён:
   a. першы дзень – іспыт па польскай мове, адбываецца цягам 120 хвілін;
   b. другі дзень – іспыт па матэматыцы, адбываецца цягам 100 хвілін;
   c. трэці дзень – іспыт па сучаснай замежнай мове; пачынаючы з 2022 года – таксама іспыт па прадмеце па выбары; кожны паасобны іспыт адбываецца цягам 90 хвілін[10].

2. У хранаметражы экзамену васьмікласніка не ўлічваецца час, прызначаны на праверку вучнем правільнасці перанясення адказаў на аркуш адказаў (5 хвілін).

3. Іспыт па кожным паасобным прадмеце пачынаецца згодна з часам, пададзеным у графіку правядзення экзамену васьмікласніка. Графік размяшчаецца на сайце

[10] Працягласць экзамену па паасобных прадметах можа павялічвацца для вучняў, якія маюць права на адмысловыя дастасаваныя ўмовы экзаменавання.

Цэнтральнай экзаменацыйнай камісіі да 20-га жніўня навучальнага года, які папярэднічае году, у якім праводзіцца экзамен.

4. Экзамен па кожным прадмеце праводзіцца групай назіральнікаў:

| | |
|---|---|
| колькасць настаўнікаў у групе | прынамсі 2 (залежыць ад колькасці вучняў у дадзенай зале) |
| склад групы | прынамсі 1 настаўнік з іншай школы |
| асобы, якія не ўключаюцца ў групу | настаўнікі па прадмеце, па якім праводзіцца экзамен |

5. Падрабязнае апісанне ходу экзамену васьмікласніка можна знайсці ў раздзеле *Інфармацыя па арганізацыі і правядзенні экзамену васьмікласніка* штогадовага Бюлетэня грамадскай інфармацыі на інтэрнэт-старонцы ЦЭК. Падрабязнасці адносна працы з экзаменацыйным аркушам па паасобных прадметах падаюцца ў інфармацыі на тытульнай старонцы кожнага экзаменацыйнага аркуша.

6. Падчас іспыту па любым з экзаменацыйных прадметаў кожны вучань сядзіць за асобным сталом. На стале могуць быць толькі экзаменацыйныя аркушы, матэрыялы і дапаможныя прылады, пералічаныя ў абвестцы дырэктара ЦЭК, а таксама – у выпадку хворых вучняў і вучняў з абмежаванымі магчымасцямі – лекі і дапаможныя сродкі, абумоўленыя характарам хваробы альбо абмежаванняў магчымасцяў.

7. У экзаменацыйную залу нельга ўносіць аніякіх тэлекамунікацыйных прылад – мабільных тэлефонаў, прайгравальнікаў mp3, разумных гадзіннікаў і т.д. – а таксама карыстацца гэтымі прыладамі ў гэтай зале. Кожнае парушэнне пацягне за сабойануляванне экзамену па дадзеным прадмеце (гл.: Секцыя J *Інфармацыйнага даведнік*).

8. Падчас іспыту вучні могуць у слушных выпадках пакідаць экзаменацыйную залу, атрымаўшы дазвол кіраўніка групы назіральнікаў. Пры гэтым павінна выключацца магчымасць кантактавання вучняў з іншымі асобамі, за выключэннем асоб, што аказваюць медыцынскую дапамогу.

9. Члены назіральнай групы не могуць тлумачыць вучням экзаменацыйных заданняў, а таксама не могуць якім-небудзь чынам каментаваць гэтых заданняў.

10. У выпадку:
    a. выяўлення несамастойнага выканання экзаменацыйных заданняў альбо
    b. стварэння перашкод ходу экзамену альбо
    c. унясення ў экзаменацыйную залу матэрыялаў і дапаможных прылад, не прадугледжаных у абвестцы дырэктара ЦЭК, экзамен такога вучня па дадзеным прадмеце можа быць скасаваны (гл.: Секцыя J *Інфармацыйнага даведніка*).

## F. Ацэньванне і вынікі экзамену васьмікласніка

1. Выкананне заданняў адкрытага тыпу правяраюць і ацэньваюць у балах экзаменатары, вызначаныя дырэктарам акруговай экзаменацыйнай камісіі.

2. Экзаменатары карыстаюцца адзінымі агульнадзяржаўнымі крытэрыямі ацэньвання.

3. Выкананне заданняў закрытага тыпу правяраецца пры дапамозе электронных прыстасаванняў (чытнікаў аркушаў адказу).

4. Вынік экзамену васьмікласніка па кожным прадмеце падаецца ў працэнтах і ў бале па працэнтыльнай шкале.
   a. Працэнтны вынік – адсотак балаў (закруглены да цэлага ліку), якія вучань атрымаў за выкананне заданняў з экзаменацыйнага аркуша. Напрыклад, калі вучань за выкананне заданняў па матэматыцы атрымаў 39 балаў з 50-ці магчымых, то яго вынік будзе роўны 78%.
   b. Вынік ў форме балу працэнтыльнай шкалы – адсотак вучняў (закруглены да цэлага ліку), якія атрымалі па акрэсленым прадмеце вынік, аднолькавы альбо горшы за вынік канкрэтнага вучня. Напрыклад, вучань, чый працэнтыльны бал па матэматыцы складае 82, даведаецца, што вынік 82% усіх вучняў, якія здавалі экзамен васьмікласніка, роўны яго выніку альбо горшы, а вынік 18% вучняў лепшы за яго вынік.

5. Працэнтныя вынікі экзамену васьмікласніка па акрэсленым прадмеце вызначае дырэктар акруговай экзаменацыйнай камісіі, а працэнтыльныя балы апрацоўвае Цэнтральная экзаменацыйная камісія.

6. Вынікі, пададзеныя дырэктарам акруговай экзаменацыйнай камісіі, не могуць быць прадметам судовага разбіральніцтва.

7. У даведцы з падрабязнымі вынікамі экзамену васьмікласніка кожны вучань будзе мець вынікі:
   a. іспыту па польскай мове;
   b. іспыту па матэматыцы;
   c. іспыту па сучаснай замежнай мове;
   d. (пачынаючы з 2022 г.) іспыту па прадмеце па выбары.

## G. Экзамен васьмікласніка на мове нацыянальнай меншасці, этнічнай меншасці ці на рэгіянальнай мове

1. Вучні школ ці аддзяленняў, у якіх навучанне адбываецца на мове нацыянальнай меншасці, этнічнай меншасці ці на рэгіянальнай мове, выконваюць заданні па матэматыцы, а пачынаючы з 2022 г., таксама заданні па прадмеце па выбары (біялогія, хімія, фізіка, геаграфія альбо гісторыя), па-польску альбо на мове дадзенай нацыянальнай меншасці, этнічнай меншасці ці на рэгіянальнай мове.

2. Адпаведную пісьмовую дэкларацыю бацькі вучня падаюць да 30-га верасня навучальнага года, у якім будзе праводзіцца экзамен (гл.: табліца ў Секцыі C *Інфармацыйнага даведніка*).

## H. ПРАВЫ ЛАЎРЭАТАЎ І ФІНАЛІСТАЎ ПРАДМЕТНЫХ АЛІМПІЯД, А ТАКСАМА ЛАЎРЭАТАЎ ПРАДМЕТНЫХ КОНКУРСАЎ УЗРОЎНЮ ВАЯВОДСТВА І ВЫШЭЙ

1. Вучань, які стаў лаўрэатам ці фіналістам прадметнай алімпіяды альбо лаўрэатам прадметнага конкурсу ўзроўню ваяводства і вышэй, праведзеных па адным з прадметаў, што ўваходзяць у экзамен васьмікласніка, вызваляецца ад іспыту па гэтым прадмеце.

2. Пералік алімпіяд па экзаменацыйным прадмеце / прадметах, якія даюць права лаўрэатам і фіналістам быць вызваленымі ад іспыту па дадзеным прадмеце, падае міністр адукацыі ў форме абвесткі ў Бюлетэні грамадскай інфармацыі МНА[11].

3. У даведцы з падрабязнымі вынікамі экзамену васьмікласніка ў выпадку вучня, вызваленага ад здачы іспыту, у рубрыцы дадзенага прадмету будзе ўпісана слова „вызвалены” альбо „вызваленая”, а таксама пададзены максімальны вынік – „100%” (працэнтны вынік) і „100” (працэнтыльны бал). [12]

4. Вучань, які стаў лаўрэатам прадметнага конкурсу ўзроўню ваяводства і вышэй альбо лаўрэатам ці фіналістам алімпіяды па сучаснай замежнай мове альбо – пачынаючы з 2022 г. – па дадатковым прадмеце (іншага ад пазначанага ў дэкларацыі, пададзенай да 30-га верасня), можа змяніць падметы, пазначаныя ў дэкларацыі, на прадметы, па якіх ён стаў лаўрэатам конкурсу / лаўрэатам ці фіналістам алімпіяды. Інфармацыя наконт гэтых зменаў перадаецца ў акруговую экзаменацыйную камісію дырэктарам школы згодна з заяваю бацькоў вучня альбо заяваю слухача – не пазней чым за 2 тыдні да экзамену васьмікласніка. Сучасная замежная мова можа быць замененая выключна на такую замежную мову, якую вучань вывучаў на абавязковых адукацыйных занятках.

## I. ПРАВЫ ВУЧНЯЎ З АДМЫСЛОВЫМІ АДУКАЦЫЙНЫМІ ПАТРЭБАМІ, А ТАКСАМА ПРАВЫ АСОБ, ПРА ЯКІХ ГАВОРКА Ў АРТ. 165 ПАР. 1 ЗАКОНА *АДУКАЦЫЙНАЕ ПРАВА* (ІНШАЗЕМЦАЎ)

1. Вучні са спецыяльнымі адукацыйнымі патрэбамі, у тым ліку вучні з абмежаванымі магчымасцямі, несацыялізаваныя асобы і асобы з праблемнай сацыялізацыяй, а таксама асобы, пра якіх гаворка ў арт. 165 пар. 1 закона *Адукацыйнае права*,[13] здаюць экзамен васьмікласніка ў адпаведнасці з агульным графікам і паводле актуальных экзаменацыйных патрабаванняў на ўмовах альбо ў форме, дастасаваных да іх патрэб.

---

[11] Абвестка на 2018/2019 навучальны год даступная па адрасе: https://bip.men.gov.pl/wp-content/uploads/sites/2/2017/04/tresc-komunikatu.pdf

[12] Правы, пра якія гаворка ў п. H.1. і H.3., маюць таксама вучні ранейшай шасцігадовай базавай школы, а таксама вучні ранейшых гімназій, якія сталі лаўрэатамі альбо фіналістамі алімпіяды альбо лаўрэатамі конкурсу на ўзроўні ваяводства і вышэй, што праводзіліся па адным з прадметаў, які ўваходзіць у экзамен васьмікласніка (арт. 299 і 301 закона ад 14 снежня 2016 г. *Нормы ўвядзення заканадаўчага акта – Адукацыйнае права*).

[13] Зб. з.а. ад 2017 г. паз. 59, са зм.

2. Дастасаванне ўмоў альбо формаў правядзення экзамену васьмікласніка адбываецца на падставе дакументаў, вызначаных у наступнай табліцы:

| ДАКУМЕНТ | ГРУПЫ ВУЧНЯЎ, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПРАВА НА ДАСТАСАВАННЕ |
|---|---|
| a. заключэнне пра неабходнасць адмысловага навучання | вучні:<br>• з парушэннямі слыху і глухія;<br>• слабавідушчыя і невідушчыя;<br>• з абмежаванымі магчымасцямі руху;<br>• з афазіяй;<br>• з абмежаванымі інтэлектуальнымі здольнасцямі – у лёгкай ступені;<br>• з аўтызмам, у тым ліку з сіндромам Аспрэргера;<br>• несацыялізавацыя ці з праблемнай сацыялізацыяй. |
| b. даведка пра стан здароўя, выдадзеная ўрачом | вучні:<br>• з часовай нефункцыянальнасцю рук;<br>• з хранічнымі захворваннямі;<br>• хворыя і з часовымі абмежаваннямі магчымасцяў. |
| c. заключэнне педагагічнай рады | вучні:<br>• у крызіснай ці траўматычнай сітуацыі;<br>• з адаптацыйнымі цяжкасцямі, звязанымі з папярэднім навучаннем за мяжой;<br>• з парушэннямі моўнай камунікацыі;<br>• пра якіх гаворка ў арт. 165 пар. 1 закона *Адукацыйнае права* (іншаземцы). |
| d. заключэнне псіхолага--педагагічнай кансультацыі, у тым ліку спецыялізаванай кансультацыі | вучні:<br>• са спецыфічнымі цяжкасцямі ў навучанні, напр., з дыслексіяй, дысграфіяй, дысарфаграфіяй, дыскалькуліяй;<br>• з парушэннямі моўнай камунікацыі. |
| e. заключэнне наконт патрэбы ў індывідуальным навучанні | вучні з хранічнымі захворваннямі. |

3. Даведку пра стан здароўя альбо заключэнне псіхолага-педагагічнай кансультацыі належыць прадставіць дырэктару школы не пазней, чым да 15-га кастрычніка. Калі дакумент быў выдадзены ў пазнейшым тэрміне, трэба прад’явіць яго неадкладна пасля атрымання.

4. Спосаб дастасавання ўмоў альбо формаў правядзення экзамену васьмікласніка да патрэб і магчымасцяў дадзенага вучня вызначае педагагічная рада на падставе варыянтаў, прапанаваных у абвестцы дырэктара ЦЭК. Гэтая абвестка публікуецца ў тэрміне да 10 верасня навучальнага года, у якім адбудзецца экзамен васьмікласніка.

5. Дырэктар школы альбо ўпаўнаважаны ім настаўнік абавязаны ў тэрміне да 30-га верасня паінфармаваць бацькоў пра магчымасці дастасавання ўмоў і формаў правядзення экзамену васьмікласніка. Не пазней, чым да 20-га лістапада дырэктар школы перадае бацькам вучня пісьмовую інфармацыю наконт спосабу дастасавання ўмоў альбо формаў экзаменавання, вызначанага вучню педагагічнай радай. Калі неабходнасць дастасавання ўмоў і формаў экзамену выявілася пасля 20-га лістапада,

дырэктар школы неадкладна інфармуе бацькоў вучня і дырэктара акруговай экзаменацыйнай камісіі пра вызначаныя педагагічнаю радай дастасаванні.

6. У асаблівых сітуацыях, звязаных са станам здароўя ці абмежаваннем магчымасцяў вучня, пасля згоды дырэктара акруговай экзаменацыйнай камісіі экзамен васьмікласніка можа адбыцца па-за школай, напр., у доме вучня. Адмысловую заяву падае дырэктар школы пры папярэднім узгадненні з бацькамі вучня – у тэрміне прыблізна да 15-га студзеня.

7. Экзаменаванне на ўмовах, вызначаных педагагічнаю радай, запэўнівае кіраўнік экзаменацыйнай групы.

## J. СКАСАВАННЕ ЭКЗАМЕНУ ВАСЬМІКЛАСНІКА ПА ДАДЗЕНЫМ ПРАДМЕЦЕ

1. Вучань абавязаны самастойна выконваць заданні з экзаменацыйнага аркуша, асабліва гэта датычыць стварэння ўласнага тэксту і самастойнага рашэння задач падчас экзамену.

2. Экзамен васьмікласніка па дадзеным прадмеце можа быць скасаваны.

3. Скасаванне можа адбыцца:
   a. падчас экзамену альбо
   b. пасля іспыту, калі падчас праверкі экзаменацыйнай працы будзе ўстаноўлена, што вучань выконваў экзаменацыйнае заданне / заданні несамастойна.

4. Ануляванне падчас экзамену адбываецца, калі вучань:
   a. несамастойна рашае экзаменацыйныя заданні;
   b. прынёс у экзаменацыйную залу якую-кольвечы тэлекамунікацыйную прыладу альбо карыстаецца гэтай прыладаю ў экзаменацыйнай зале;
   c. прынёс у экзаменацыйную залу матэрыялы ці прылады, не згаданыя ў абвестцы дырэктара ЦЭК у справе дапаможных матэрыялаў і прыстасаванняў;
   d. парушае вызначаны ход экзамену, перашкаджаючы ў працы іншым вучням.

5. Рашэнне пра скасаванне падчас іспыту прымае кіраўнік экзаменацыйнай групы (звычайна – дырэктар школы).

6. Ануляванне падчас праверкі экзаменацыйнай працы адбываецца, калі ўстанаўліваецца несамастойнасць выканання вучнем задання / заданняў у экзаменацыйным аркушы, асабліва ў выпадку выяўлення ў працы вучня аднолькавых фармулёвак, што ўказвае на:
   a. перадачу рашэння іншаму вучню;
   b. карыстанне рашэннем, зробленым іншым вучнем;
   c. карыстанне падчас іспыту недазволеным матэрыяламі, напр., перапісванне фрагменту працы з падручніка, дапаможніка, сайта;
   d. скап'яванне фрагменту тэксту, размешчанага ў экзаменацыйным аркушы.

7. Рашэнне пра скасавання падчас праверкі экзаменацыйнай працы прымае дырэктар АЭК альбо дырэктар ЦЭК.

8. Падрабязная інфармацыя наконт парадку касавання экзамену васьмікласніка па дадзеным прадмеце знаходзіцца ў раздзеле *Інфармацыя па арганізацыі і правядзенні экзамену васьмікласніка* актуальнага Бюлетэня грамадскай інфармацыі на інтэрнэт-старонцы ЦЭК. Магчымы парадак дзеянняў у выпадку анулявання дадзенага экзамену васьмікласніка ў сувязі з устанаўленнем экзаменатарам несамастойнага выканання вучнем задання / заданняў – у дыяграме ніжэй. Парадак дзеянняў пазначаны адпаведна чорнымі ці чырвонымі стрэлкамі.
   a. Парадак дзеянняў, пазначаны чорнымі стрэлкамі, адлюстроўвае паасобныя крокі ў працэсе, калі дырэктар школы мае магчымасць перадаць бацькам вучня інфармацыю ад дырэктара АЭК адносна намеру ануляваць дадзены экзамен.
   b. Парадак дзеянняў, пазначаны чырвонымі стрэлкамі, адлюстроўвае паасобныя крокі ў працэсе, калі дырэктар школы не мае магчымасці перадаць бацькам вучня вышэйзгаданай інфармацыі.

9. У *Інфармацыі,* пра якую гаворка ў п. 8., даступныя ўсе ўзоры фармуляраў, неабходных вучню альбо яго бацькам у выпадку правядзення працэдуры касавання экзамену гэтага вучня з дадзенага прадмету.

10. Ануляванне экзамену васьмікласніка па акрэсленым прадмеце, што адбыўся ў асноўным тэрміне, азначае абавязковую здачу іспыту ў дадатковым тэрміне.

11. Ануляванне экзамену васьмікласніка па акрэсленым прадмеце, што адбыўся ў дадатковым тэрміне, вядзе да атрымання выніку „0%” па гэтым прадмеце.


Экзаменатар аднатоўвае несамастойнасць вучня пры выкананні задання ці заданняў. Адпаведная інфармацыя падаецца ў АЭК.
АЭК аналізуе зварот экзаменатара.
Дырэктар АЭК падзяляе думку экзаменатара.
Дырэктар АЭК не падзяляе думкі экзаменатара.
Дырэктар АЭК перадае вучню ці яго бацькам – праз дырэктара школы – пісьмовую інфармацыю наконт намеру ануляваць дадзены экзамен.
Дырэктар школы **неадкладна** перадае інфармацыю вучню ці яго бацькам.
Дырэктар школы не мае магчымасці перадаць вучню ці яго бацькам інфармацыі.
Дырэктар школы перадае інфармацыю дырэктару АЭК.
2 рабочыя дні ад атрымання інфармацыі.
Вучань ці яго бацькі падаюць заяву дырэктару АЭК пра азнаямленне з дакументацыяй.
Вучань ці яго бацькі не падаюць заявы дырэктару АЭК пра азнаямленне з дакументацыяй.
7 дзён ад атрымання інфармацыі дырэктара школы.
не больш за 7 дзён ад атрымання заявы.
Дырэктар АЭК дае доступ да дакументацыі і магчымасць падаць тлумачэнні.
14 дзён ад заканчэння тэрміну падачы заявы.
не больш за 7 дзён ад атрымання заявы.
Дырэктар АЭК адмаўляецца ад касавання.
Дырэктар АЭК пацвярджае намер і скасоўвае дадзены экзамен.
3 рабочыя дні ад азнаямлення з дакументацыяй і падачы тлумачэнняў.
Дырэктар АЭК (пры пасрэдніцтве дырэктара школы) перадае вучню ці яго бацькам пісьмовую інфармацыю пра ануляванне і яго абгрунтаванне.
3 рабочыя дні ад атрымання інфармацыі пра ануляванне.
Вучань ці яго бацькі могуць падаць на імя дырэктара ЦЭК праз дырэктара АЭК заяву з заўвагамі адносна рашэння дырэктара АЭК.
7дзён ад атрымання заўваг з дакументацыяй з АЭК
Дырэктар ЦЭК прымае канчатковае рашэнне, якое не можа быць прадметам скаргі ў адміністрацыйны суд.
Дырэктар АЭК адмаўляецца ад анулявання.

## K. Заўвагі адносна парушэння правілаў правядзення экзамену

1. Калі, на думку вучня ці яго бацькоў, падчас экзамену васьмікласніка адбылося парушэнне правілаў экзаменавання, вучань ці яго бацькі могуць на працягу 2 рабочых дзён ад дня іспыту па дадзеным прадмеце падаць у пісьмовай форме заўвагі на імя дырэктара акруговай экзаменацыйнай камісіі.

2. Падрабязная інфармацыя пра парадак падачы заўваг адносна парушэння правілаў правядзення экзамену знаходзіцца ў раздзеле *Інфармацыя па арганізацыі і правядзенні экзамену васьмікласніка* актуальнага Бюлетэня грамадскай інфармацыі на інтэрнэт-старонцы ЦЭК. На дыяграме ніжэй паказана схема дзеянняў у выпадку анулявання ў сувязі з падачаю вучнем альбо яго бацькамі абгрунтаваных заўваг наконт парушэння правілаў правядзення экзамену васьмікласніка.

3. У *Інфармацыі*, пра якую гаворка ў п. 2., даступныя ўсе ўзоры фармуляраў, неабходных вучню альбо яго бацькам для падачы заўваг пра парушэнні правілаў правядзення экзамену васьмікласніка.



## L. Азнаямленне з экзаменацыйнай працай і заяўка на пераправерку прызнаных балаў

1. На працягу 6-ці месяцаў ад дня выдачы акруговай экзаменацыйнай камісіяй даведкі/інфармацыі з падрабязнымі вынікамі экзамену васьмікласніка вучань альбо яго бацькі маюць права доступу да праверанай і ацэненай экзаменацыйнай працы гэтага вучня ў месцы і часе, вызначаным дырэктарам акруговай экзаменацыйнай камісіі.

2. Заяўка на доступ да экзаменацыйнай працы падаецца на імя дырэктара адпаведнай акруговай экзаменацыйнай камісіі. Заяўку можна падаць асабіста (падае вучань ці яго бацькі) альбо перадаць ў акруговую экзаменацыйную камісію па электроннай пошце, факсе ці ў форме традыцыйнага паштовага адпраўлення.

3. Фармуляр заяўкі даступны ў раздзеле *Інфармацыя па арганізацыі і правядзенні экзамену васьмікласніка* Бюлетэня грамадскай інфармацыі на інтэрнэт-старонцы ЦЭК.

4. Дырэктар акруговай экзаменацыйнай камісіі – папярэдне атрымаўшы, калі гэта магчыма, згоду самога вучня ці яго бацькоў – на працягу не больш чым 5-ці рабочых дзён ад атрымання адпаведнай заяўкі вызначае тэрмін арганізацыі доступу да экзаменацыйнай працы (дзень і гадзіну). Акруговая камісія інфармуе вучня ці яго бацькоў пра тэрмін арганізацыі азнаямлення з працаю.

5. Дырэктар акруговай экзаменацыйнай камісіі вызначае месца арганізацыі азнаямлення з працаю. У асаблівых і слушных выпадках, звязаных з абмежаванасцю магчымасцяў вучня, дырэктар акруговай экзаменацыйнай камісіі можа даць згоду на арганізацыю і правядзенне азнаямлення з працаю па-за сценамі акруговай экзаменацыйнай камісіі.

6. Прынцыпы доступу.
   a. *Пацверджанне паўнамоцтва доступу*. Каб атрымаць доступ да працы, належыць прыйсці з дакументам, які пацвярджае асобу, напр., школьным білетам ці асабістым пасведчаннем (у выпадку бацькоў вучня і слухачоў базавай школы для дарослых).
   b. *Форма арганізацыі азнаямлення з працаю*. Вучань альбо яго бацькі маюць права азнаёміцца з экзаменацыйнай працаю ў той форме, у якой гэтая праца трапіла да экзаменатара на праверку. Перад тым, як запэўніць доступ да працы, належыць прыняць неабходныя захады, каб захаваць асабовыя даныя экзаменатара ад няслушнага абнародавання.
   c. *Час трывання азнаямлення*. Час трывання азнаямлення з адной экзаменацыйнай працай вызначае дырэктар акруговай экзаменацыйнай камісіі. Гэты час не можа быць карацейшы, чым 30 хвілін. Па просьбе асобы, якая ўпаўнаважаная азнаёміцца з працаю, пасля заканчэння часу, вызначанага дырэктарам акруговай камісіі, час доступу можа быць працягнуты ў той ступені, у якой гэта магчыма, зважыўшы на колькасць доступаў да прац, прызначаных на дадзены дзень.
   d. *Асобы, прысутныя падчас арганізацыі азнаямлення*. Азнаямленне з працай павінна ажыццяўляцца ў прысутнасці супрацоўніка акруговай экзаменацыйнай камісіі.

e. *Прынцыпы ацэньвання рашэнняў заданняў.* Падчас азнаямлення з працай вучню ці яго бацькам запэўніваецца магчымасць пазнаёміцца з прынцыпамі ацэньвання рашэнняў заданняў.
f. *Працэдура азнаямлення.* Пасля праверкі асабовых даных вучня асоба, адказная за арганізацыю доступу да працы, павінна ўпэўніцца, што вучань альбо яго бацькі азнаёміліся з працэдурай доступу.
g. Пасля таго, як азнаямленне скончылася, супрацоўнік акруговай экзаменацыйнай камісіі робіць адпаведны запіс пра рэалізацыю азнаямлення, а вучань альбо яго бацькі пацвярджаюць гэты запіс уласнаручным подпісам.
h. *Натаванне і фатаграфаванне экзаменацыйнай працы.* Падчас азнаямлення вучань альбо яго бацькі могуць весці нататкі і рабіць здымкі экзаменацыйнай працы.

7. Вучань альбо яго бацькі могуць падаць заяўку на перападлік сумы балаў. Заяўку разам з абгрунтаваннем належыць падаць на імя дырэктара акруговай экзаменацыйнай камісіі ў тэрміне 2-х рабочых дзён ад дня азнаямлення з працаю.

8. Фармуляр заяўкі даступны ў раздзеле *Інфармацыя па арганізацыі і правядзенні экзамену васьмікласніка* Бюлетэня грамадскай інфармацыі на інтэрнэт-старонцы ЦЭК.

9. Праверка сумы балаў адбываецца на працягу 7-мі дзён ад дня атрымання заяўкі.

10. Для праверкі сумы балаў дырэктар акруговай экзаменацыйнай камісіі вызначае экзаменатара, які не браў удзелу ў праверцы і ацэньванні экзаменацыйнай працы, якой датычыць пададзеная заяўка.

11. Дырэктар акруговай экзаменацыйнай камісіі інфармуе вучня альбо яго бацькоў пра вынікі праверкі сумы балаў у пісьмовай форме ў тэрміне 14-ці дзён ад дня атрымання заяўкі, пра што гаворка ў п. 7.

12. Калі ў выніку пераправеркі сума балаў была павялічана, дырэктар акруговай экзаменацыйнай камісіі зацвярджае новы вынік экзамену васьмікласніка па дадзеным прадмеце, анулюе ранейшае пасведчанне і выдае новае пасведчанне з падрабязнымі вынікамі экзамену васьмікласніка. Вучань альбо яго бацькі абавязаныя вярнуць ануляваны дакумент.

## M. ІНАФАРМАЦЫЙНЫЯ ДАВЕДНІКІ ПА ЭКЗАМЕНЕ ВАСЬМІКЛАСНІКА ПА ПААСОБНЫХ ПРАДМЕТАХ

1. Па кожным прадмеце, па якім праводзіцца экзамен васьмікласніка, падрыхтаваны адмысловы прадметны інфармацыйны даведнік, сапраўдны пачынаючы з 2018/2019 навучальнага года. На сайце Цэнтральнай экзаменацыйнай камісіі і акруговых экзаменацыйных камісій даступныя:

a. *Інфармацыйны даведнік па экзамене васьмікласніка па **польскай мове**, пачынаючы з 2018/2019 навучальнага года;*
b. *Інфармацыйны даведнік па экзамене васьмікласніка па **матэматыцы**, пачынаючы з 2018/2019 навучальнага года;*
c. *Інфармацыйны даведнік па экзамене васьмікласніка па **англійскай мове**, пачынаючы з 2018/2019 навучальнага года;*

d. *Інфармацыйны даведнік па экзамене васьмікласніка па* ***французскай мове****, пачынаючы з 2018/2019 навучальнага года;*
e. *Інфармацыйны даведнік па экзамене васьмікласніка па* ***іспанскай мове****, пачынаючы з 2018/2019 навучальнага года;*
f. *Інфармацыйны даведнік па экзамене васьмікласніка па* ***нямецкай мове****, пачынаючы з 2018/2019 навучальнага года;*
g. *Інфармацыйны даведнік па экзамене васьмікласніка па* ***рускай мове****, пачынаючы з 2018/2019 навучальнага года;*
h. *Інфармацыйны даведнік па экзамене васьмікласніка па* ***ўкраінскай мове****, пачынаючы з 2018/2019 навучальнага года;*
i. *Інфармацыйны даведнік па экзамене васьмікласніка па* ***італьянскай мове****, пачынаючы з 2018/2019 навучальнага года*[14].

2. інфармацыйныя даведнікі па экзамене васьмікласніка падрыхтаваныя і прадстаўленыя таксама ў версіях для вучняў з абмежаванымі здольнасцямі:
   a. для невідушчых вучняў (у выглядзе чарнадруку);
   b. для вучняў з парушэннямі слыху і глухіх;
   c. для вучняў з лёгкімі абмежаваннямі інтэлектуальных здольнасцяў.

3. Таксама маецца ў доступе інфармацыйны даведнік па экзамене васьмікласніка па матэматыцы (а пачынаючы з 2022 г. таксама інфармацыйныя даведнікі па экзамене васьмікласніка па біялогіі, хіміі, фізіцы, геаграфіі і гісторыі):
   a. на мовах нацыянальных меншасцяў – беларускай, іўрыце, літоўскай, нямецкай, армянскай, славацкай і ўкраінскай;
   b. на мове этнічнай меншасці – ламкоўскай;
   c. на рэгіянальнай мове – кашубскай.

4. У кожным інфрамацыйным даведніку знаходзіцца апісанне экзамену па паасобным прадмеце, а таксама ўзоры экзаменацыйных заданняў з рашэннямі.

5. У экзаменацыйных аркушах могуць знаходзіцца заданні, адпаведныя ўсім патрабаванням, акрэсленым у базавай праграме агульнага навучання, у тым ліку заданні, якія адрозніваюцца ад тых, што пададзеныя ў *Інфармацыйным даведніку* ў якасці прыкладаў. Адзіным эфектыўным спосабам падрыхтоўкі да экзамену васьмікласніка з'яўляецца прысваенне ведаў і ўменняў, якія дазволяць выканаць усе патрабаванні праграмы.

## N. Важная інфармацыя для бацькоў васьмікласнікаў

Шаноўныя бацькі! Пераканайцеся, што вашыя дзеці і вы самі валодаеце ў поўнай меры інфармацыяй адносна пытанняў, зазначаных ніжэй. Усю неабходную інфармацыю можна атрымаць з дадзенай публікацыі. Пры неабходнасці дадатковую інфармацыю вы можаце атрымаць, звярнуўшыся да дырэктара школы, класнага кіраўніка альбо скантактаваўшыся з акруговай экзаменацыйнай камісіяй.

[14] Інафармацыйныя даведнікі па экзамене васьмікласніка па біялогіі, хіміі, фізіцы, геаграфіі і гісторыі будуць прадстаўленыя да 1 верасня 2020 г. (арт. 267 пар. 2 п. 1 Закона ад 14 снежня 2016 г. *Нормы ўвядзення заканадаўчага акта – Адукацыйнае права*).

Найвайжнейшыя аспекты правядзення экзамену васьмікласніка:

1. графік правядзення экзаменаў – у асноўным і дадатковым тэрмінах, а таксама ўмовы атрымання допуску да экзамену ў дадатковым тэрміне;

2. структура экзамену (экзаменацыйныя прадметы ў дадзеным навучальным годзе, працягласць экзамену па паасобных прадметах, а таксама павелічэнне працягласці экзаменавання ў сітуацыі дастасавання ўмоў альбо формаў экзаменавання), пералік кантраляваных уменняў – праграмная падстава агульнага навучання;

3. прынцыпы экзаменавання (працэс правядзення экзамену штодня)

4. спосаб зазначэння адказу на аркушы адказаў, а таксама дадатковы час (5 хвілін), прызначаны для праверкі адпаведнасці пераносу адказаў на аркуш адказаў;

5. забарона ўносіць у экзаменацыйную залу телекамунікацыныя прылады, а таксама карыстацца імі ў гэтай зале;

6. дапаможныя матэрыялу і прылады, якія вучням дазваляецца прынесці ў экзаменацыйную залу;

7. неабходнасць самастойна рашаць заданні падчас экзамену, а таксама наступствы ў выпадку парушэння прынцыпу самастойнасці;

8. магчымасць азнаёміцца з праверанай і ацэненай экзаменацыйнай працай, а таксама магчымасць падаць заяву пра паўторны падлік сумы балаў.

Тэрміны, пра якія варта памятаць:

| | |
|---|---|
| да 30-га верасня | Школа павінна пазнаёміць бацькоў з магчымасцямі дастасавання ўмоў і формаў іспыту на экзамене васьмікласніка. |
| да 30-га верасня | Бацькі павінны падаць на імя дырэктара школы пісьмовую дэкларацыю з наступнымі звесткамі:<br>a. сучасная замежная мова, па якой вучань будзе здаваць экзамен;<br>b. (пачынаючы з 2022 г.) прадмет па выбары, па якім вучань будзе здаваць экзамен;<br>c. намер здаваць экзамен па матэматыцы (а пачынаючы з 2022 г. таксама намер здаваць экзамен па прадмеце па выбары) на мове нацыянальнай меншасці, этнічнай меншасці ці на рэгіянальнай мове. |
| да 15-га кастрычіка | Бацькі прадастаўляюць дырэктару школы даведку пра стан здароўя вучня альбо заключэнне псіхолага-педагагічнай кансультацыі – пры ўмове, што гэты дакумент не быў прадастаўлены раней. |

| | |
|---|---|
| Не пазней, чым да 20-га лістапада[15] | Школа павінна перадаць бацькам у пісьмовай форме інфармацыю наконт вызначанага педагагічнай радаю спосабу дастасавання ўмоў ці формы правядзення экзамену васьмікласніка да адукацыйных і псіхалагічных патрэбаў вучняў. На працягу трох рабочых дзён ад моманту атрымання вышэйзгаданай інфармацыі бацькі павінны падаць заяву пра скарыстанне альбо нескарыстанне з пададзеных спосабаў дастасавання ўмоў ці формы правядзення экзамену. |
| Прыблізна да 15 га студзеня[15] | Бацькі ў пісьмовай форме падаюць інфармацыю пра змены ў дэкларацыі, пададзенай да 30 верасня. |
| Прыблізна да 15-га студзеня[15] | Па атрыманні згоды дырэктара школы падача заявы наконт правядзення экзамену па-за школай, у іншым месцы (гл.: Секцыя I п. 6 *Інфармацыйнага даведніка*). |
| Прыблізна да 30 га сакавіка[15] | Бацькі падаюць дырэктару школы заяву наконт замены дэклараванага прадмету – датычыць вучняў, якія сталі лаўрэатамі альбо фіналістамі прадметных алімпіяд альбо лаўрэатамі прадметных конкурсаў на ўзроўні ваяводства і вышэй. |
| Другая палова красавіка | Асноўны тэрмін экзамену васьмікласніка. |
| Першая палова чэрвеня | Дадатковы тэрмін экзамену васьмікласніка. |
| Тыдзень перад заканчэннем навучальнага года | Акруговая экзаменацыйная камісія перадае вынікі экзамену васьмікласніка ў школы. |
| Дзень заканчэння навучальнага года | Вучань разам з пасведчаннем атрымлівае даведку з падрабязнымі вынікамі экзамену васьмікласніка. |

Больш падрабязную інфармацыю па арганізацыі і правядзенні экзамену васьмікласніка ў дадзеным годзе, у тым ліку ўзоры патрэбных дакументаў, можна знайсці ў раздзеле *Інфармацыя па арганізацыі і правядзенні экзамену васьмікласніка* на інтэрнэт-старонцы Цэнтральнай экзаменацыйнай камісіі, у закладцы „Экзамен васьмікласніка” > „Расклады, абвесткі і інфармацыя”.

[15] Дакладны тэрмін залежыць ад тэрміну правядзення экзамену ў канкрэтным навучальным годзе і падаецца ў раздзеле *Інфармацыя па арганізацыі і правядзенні экзамену васьмікласніка,* публікаваным у дадзеным навучальным годзе ў Бюлетэні грамадскай інфармацыі на інтэрнэт-старонцы ЦЭК.

На інтэрнэт-старонцы ЦЭК (www.cke.edu.pl) таксама даступныя альбо будуць даступныя:

| | |
|---|---|
| пачынаючы з 1 верасня 2017 г. | інфармацыныя даведнікі па экзамене васьмікласніка па польскай мове, матэматыцы і сучасных замежных мовах |
| пачынаючы з 18 снежня 2017 г. | узоры экзаменацыйных аркушаў па польскай мове, матэматыцы і сучасных замежных мовах |
| пачынаючы з 21 снежня 2018 г. | тэставыя экзаменацыйныя аркушы па польскай мове, матэматыцы і сучасных замежных мовах |
| пачынаючы з канца красавіка 2019 г. | экзаменацыйныя аркушы, што выкарыстоўваліся для правядзення экзамену васьмікласніка па паасобных прадметах у папярэднія гады |
| пачынаючы з 1 верасня 2020 г. | інфармацыныя даведнікі па экзамене васьмікласніка па біялогіі, хіміі, фізіцы, геаграфіі і гісторыі. |
| пачынаючы з 18 снежня 2020 г. | узоры экзаменацыйных аркушаў па біялогіі, хіміі, фізіцы, геаграфіі і гісторыі |
| пачынаючы з 20 снежня 2021 г. | тэставыя экзаменацыйныя аркушы па біялогіі, хіміі, фізіцы, геаграфіі і гісторыі. |